## ЛЯЛЬКО ДЗМІТРЫЙ ІВАНАВІЧ



Паэт, кампазітар, спявак, мастак. Нарадзіўся 22.05.1971 г. ў г. п. Воранава. Скончыў Воранаўскую сярэднюю школу (1988), Мірскае вучылішча рэстаўрацыйна-мастацкіх работ (з адзнакай, 1992). Атрымаў спецыяльнасць рэзчыка-сталяра-інструктара. Працаваў настаўнікам у сельскай школе ( 1993). З 1996 г. — у рэстаўрацыйных майстэрнях за мяжой (працаваў ў Польшчы і Германіі) рэстаўрыраваў мэблю XV—XVIII ст. У 1999—2001 гг. мастак Воранаўскага РДК. Працаваў кіраўнікам гуртковай работы ў Воранаўскім прафесійна-тэхнічным сельскагаспадарчым каледжы.

Дз. І. Лялько – лаўрэат Усесаюзнага рок-фестывалю ў Маскве (1989), абласных і рэспубліканскіх фестываляў бардаўскай песні (1999), абласных фестываляў патрыятычнай песні “Песні нашых сэрцаў” у Гродне (2000-2001гг.), фестываля, прысвечанага 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (2004) і інш.

У 2004 г. Дзмітрый Лялько разам з сябрамі арганізавалі пры касцёле святых апосталаў Сімяона і Іуды Фабея г. п. Воранава хрысціянскую музыкальную групу “Эйрэнэ”, якая не раз станавілася лаўрэатам розных конкурсаў і фестываляў:

2004 г. — лаўрэаты XX міжнароднага фестывалю хрысціянскай песні г. Квідзын (Польшча)

2009-2010 гг. — лаўрэаты міжнароднага фестывалю палацінскай моладзі (г. Варшава)

2013 г. — пераможцы адкрытага фестывалю аўтарскай песні (г.Зельва Гродзенскай вобласці)

2014 г. — 2-ое месца на адкрытым фестывалю аўтарскай песні (г.Зельва Гродзенскай вобласці)

2015 г. — лаўрэаты фестывалю альтэрнатыўнай музыкі (рок-музыкі) г. Ваўкавыск.

Разнастайныя па сваёй тэматыке карціны Дз. І. Лялько. Гэта і біблейскія сюжэты (“Апакаліпсіс”, 1996; “Майсей”, “Выпрабаванне грахом жанчыны-дзявіцы”, абедзве 1999; “Узнясенне на нябёсы госпада нашага Ісуса Хрыста”, 2003 і інш.); нацюрморты (“Белыя калы”, “Ружы”, “Нацюрморт з нарцысамі ў сіняй вадзе”, усе 2003); пейзажы (“Восень”, “Вясна”, абодва 2001). У 2000 г. Дзмітрый Іванавіч стаў лаўрэатам рэспубліканскіх выстаў: нетрадыцыйная жывапіс і прысвечаная 2000-годдзю хрысціянства.

Дзмітрый Лялько займаецца разьбой: вырабляе скульптуры, статуэткі, мэблю (“Напольны гадзіннік”, “Бюро”, усе 1997; “Галава вікінга”, 1998; “Шахматы”, 2000).

Да творчых захапленняў Дз. Лялько належаць музычнае і літаратурнае. Ён піша вершы і музыку на іх. Як вынік – шматлікія перамогі ў рознага ўзроўню конкурсах і фестывалях ў намінацыі «Аўтар і выканаўца». Выконвае песні на рускай, беларускай і польскай мовах.

У цяперашні час Дз. Лялько працуе педагогам, кіраўніком аб’яднання па інтарэсам «Палітра» і «Юны мадэліст» у Воранаўскім цэнтры творчасці дзяцей і моладзі. Яго вучні неаднаразова станавіліся прызёрамі разнастайных конкурсаў.

**Бібліяграфія:**


1.Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Воранаўскага раёна / рэд.кал.: Г.П.Пашкоў (гал. Рэд.) і інш.; маст. Э.Э.Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2004. – С. 497.

2. Бибикова, А. Родовое гнездо: в нем Дмитрий Лялько строит жизнь своими руками / Гродзенская праўда. — 2010. — 12 мая. — С. 4.

3. Мирская, Л. Великое достоинство искусство… / Людмила Мирская // Воранаўская газета. — 2004. — 14 чэрвеня. — С. 6.

4. Станкевич, К. Живет такой парень / Беларуская нива. — 2003. — 30 августа. — С. 4.

**Творчыя работы:**




































## Вершы:

**Лялько, Д.** Александра: стихотворение / Дмитрий Лялько // Воранаўская газета. — 1997. — 16 чэрвеня (№ 37). — С. 6. ББК М81

**Лялько, Д.** В чем беда?: стихотворение / Дмитрий Лялько // Воранаўская газета. — 2000. — 19 мая (№ 41). — С. 5. ББК М81

**Лялько, Д.** Признание: стихотворение / Дмитрий Лялько // Воранаўская газета. — 2000. — 19 мая (№ 41). — С. 5. ББК М81

**Лялько, Д.** Беларусь: верш / Дз.Лялько // Воранаўская газета. — 2001. — 1 ліпеня (№ 53). — С. 5. ББК М81

**Лялько, Д.** Очень жаль: стихотворение / Дмитрий Лялько // Воранаўская газета. — 2001. — 7 верасня (№ 62). — С. 6. ББК М81

**Лялько, Д.** Росток пшеницы: стихотворение / Дмитрий Лялько // Воранаўская газета. — 2001. — 7 верасня (№ 62). — С. 6. ББК М81

**Лялько, Д.** Зноў лісток прытулю…: верш / Дз.Лялько // Воранаўская газета. — 2001. — 18 кастрычніка (№ 71). — С. 6. ББК М81

**Лялько, Д.** Вернисаж. Откровение: стихи / Дмитрий Лялько // Воранаўская газета. — 2001. — 6 снежня (№ 92). — С. 6. ББК М81

**Лялько, Д.** Муки души: стихотворение / Дмитрий Лялько // Воранаўская газета. — 2002. — 17 красавіка (№ 32). — С. 6. ББК М81

**Лялько, Д.** Откровение: посвящается Татьяне Р. / Дмитрий Лялько // Воранаўская газета. — 2004. — 14 чэрвеня. — С. 6.

**Лялько, Д.** Мне повезло: стихотворение / Дмитрий Лялько // Воранаўская газета. — 2004. — 8 ліпеня (№ 50). — С. 6.

**Лялько, Д.** Незабудка: стихотворение / Дмитрий Лялько // Воранаўская газета. — 2005. — 13 чэрвеня (№ 45). — С. 6.

**Лялько, Д.** Досада: стихотворение / Дмитрий Лялько // Воранаўская газета. — 2005. — 4 верасня (№ 61). — С. 6.

**Лялько, Д.** Давно звенел последний мой звонок…: стихотворение / Дмитрий Лялько // Воранаўская газета. — 2008. — 27 мая (№ 39). — С. 6.

**Лялько, Д.** 300 шагов: стихотворение / Дмитрий Лялько // Воранаўская газета. — 2019. — 26 чэрвеня (№ 48). — С. 6. ББК М81
*К 75-летию освобождения Беларуси.*